# *СУСТРЭЧА 10*

# *СУПОЛКА – МЕСЦА ПРАКТЫКАВАННЯ ЛЮБОВІ ДА БЛІЖНЯГА*

«Будзьце міласэрнымі, як і Айцец ваш міласэрны» (Лк 6, 36).

**1. Уводзіны**

Пасля тэм, якія дапамагалі нам паглядзець на сужэнства, на боскую і чалавечую натуру саюзу мужчыны і жанчыны, на сям'ю, якая з'яўляецца плодам любові, прыйшоў час паглядзець на суполку, як на малы Касцёл. Касцёл, у якім ёсць братэрская любоў і ёсць Хрыстос.

**2. Сустрэча суполкі**

## *І ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*



***Супольны пасілак і дзяленне жыццём***

У І частцы сустрэчы, падчас пасілку, мы дзелімся жыццём. Просім вас не занядбоўваць падрыхтоўкі да гэтай часткі сустрэчы. Гэта не проста гутарка. Сэнс у тым, каб уважліва паглядзець на мінулы час і ўзяць з яго тое, што мы лічым найважнейшым. У вашым сужэнстве вы павінны прыняць рашэнне аб тым, чым падзеліцеся. Мы заахвочваем вас, каб вы па пунктах запісалі галоўныя думкі дзялення, бо тады значна лягчэй выказвацца. Як вы заўважылі, часу ніколі не бывае зашмат.

## *ІІ ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*



***Малітва супольнасці***

Малітва нашай супольнасці мае свой устаноўлены план. Аднак, калі вы бачыце нейкую магчымасць, каб узбагаціць малітву – не бойцеся прапанаваць штосьці новае.

**Любоў да непрыяцеляў (Лк 6, 31-36)**

«Як хочаце, каб рабілі вам людзі, так вы ім рабіце. Калі любіце тых, хто любіць вас, якая вам за гэта падзяка? Бо грэшнікі таксама любяць тых, хто іх любіць. Калі чыніце дабро тым, хто вам чыніць дабро, якая вам за тое падзяка? І грэшнікі робяць тое самае. Калі пазычаеце тым, ад каго спадзяецеся атрымаць назад, якая вам за тое падзяка? Бо і грэшнікі пазычаюць грэшнікам, каб атрымаць столькі ж.

Але вы любіце ворагаў вашых, рабіце дабро і пазычайце, не чакаючы нічога ўзамен, а ўзнагарода вашая будзе вялікая, і будзеце вы сынамі Найвышэйшага, бо Ён ласкавы да няўдзячных і да злых. Будзьце міласэрнымі, як і Айцец ваш міласэрны».

Падчас спантаннай малітвы мы прагнем запрасіць вас да малітвы перапрашэння. Мы дзякуем Богу за многія рэчы, але нажаль і за многія нам трэба прасіць у Яго

прабачэння. Асаблівым чынам падумайце аб тым, што забівала вашу ўзаемную любоў і што вы занядбалі ў любові да бліжніх.

На заканчэнне малітвы, пасля вашых інтэнцый, якія будуць скіраваныя да Бога праз духоўнага дарадчыка, можаце памаліцца прыгожым Псальмам 51.

**Псальм 51**

*Змілуйся нада мною, Божа, у вялікай міласці Тваёй;*<br>*і ў паўнаце міласэрнасці Тваёй знішчы беззаконні мае.*

*Абмый цалкам мяне ад правінаў маіх **<br>*і ачысці мяне ад граху майго.*

*Бо я ведаю беззаконні мае, **<br>*і грэх мой заўжды перада мною.*

*Табе, Табе аднаму я зграшыў **<br>*і зло ўчыніў перад Тваімі вачыма.*

*Таму Ты будзеш справядлівы ў сваім прысудзе **<br>*і беззаганны ў судзе сваім.*

*Вось я ў беззаконні зачаты, **<br>*і ў граху мяне нарадзіла маці.*

*Ты палюбіў глыбокую праўду **<br>*і навучыў мяне тайнай мудрасці.*

*Акрапі мяне ісопам – і буду чысты, **<br>*абмый мяне – і стану бялейшы за снег.*

*Дай мне пачуць радасць і вяселле, **<br>*і ўзрадуюцца косткі, якія Ты зламаў.*

*Адвярні аблічча сваё ад грахоў маіх **<br>*і знішчы ўсе мае правіны.*

*Чыстае сэрца ствары ўва мне, Божа, **<br>*і аднаві ўва мне трывалы дух.*

*Не адкінь мяне ад свайго аблічча **<br>*і не пазбаў мяне духа Твайго Святога.*

*Вярні мне радасць збаўлення Твайго **<br>*і ўмацуй мяне духам прыхільным.*

## *III ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*



***Духоўнае жыццё. Паглыбленне веры і любові***

*Дзяленне рэалізацыяй канкрэтных пунктаў высілку*

Ужо ўведзены амаль усе пункты высілку: слуханне Божага Слова, сужэнскі дыялог у Божай прысутнасці, асабістая малітва, правіла жыцця. На апошняй сустрэчы пілатуючая пара прадставіла **сужэнскую і сямейную малітву**. Просім, каб вы пачалі дзяленне з гэтага канкрэтнага пункту высілку.

## *Тэкст да абмену думкамі*

### Плёны міласэрнасці

Сёння хачу сказаць Вам, чаму так важна, каб братэрская міласэрнасць пастаянна была прысутная ў вашых суполках і каб увесь час узрастала.

**1.** Суполка павінна быць перад усім школай міласэрнасці. Калі сужэнствы практыкуюць узаемадапамогу і братэрскую любоў, іх сэрцы растуць. І паступова іх любоў выходзіць па-за іх дом, раён, краіну...

**2.** Гэта важна, каб збудаваць Касцёл, у якім увесь час прысутны Эўхарыстычны Хрыстос. Аднак таксама важным для хрысціянства з’яўляецца будаванне супольнасцяў міласэрнасці: гэта іншы спосаб паказаць прысутнасць Хрыста сярод людзей. Дзе братэрская любоў, там Хрыстос. «Бо, дзе двое ці трое сабраліся ў імя Маё, там Я ёсць сярод іх» (Мц 18, 20).

**3.** Дзе ёсць Хрыстос – там ёсць Касцёл. Касцёл ёсць там, дзе ёсць хрысціяне, якія любяць адзін аднаго. Само сабой зразумела, што Ён ёсць у супольнасці хрысціян, калі гэтая супольнасць хоча – сама па сабе – прысутнасці Касцёла, аддаючы сябе на служэнне Касцёлу.

**4.** Хрысціяне, калі яны з’яднаныя, маюць незвычайную заступніцкую моц: «Сапраўды таксама кажу вам, што калі двое з вас на зямлі згодна прасілі б аб чым-небудзь, то станецца ім ад Айца Майго, які ў нябёсах» (Мц 18, 19).

**5.** Братэрская любоў з'яўляецца ўнікальна плённай духоўнай крыніцай: пустыня вакол пачынае квітнець. Пробашч прыгараднай парафіі распавядаў мне калісьці: «Калі адна з вуліц маёй парафіі занадта “смярдзела”, я папрасіў, каб дзве хрысціянскія сям’і пасяліліся на ёй (гэта было перад вайной!) і проста сведчылі аб іх братэрскай любові. Праз шэсць месяцаў жыхары вуліцы ўздыхнулі свежым паветрам».

**6.** Практыкаванне братэрскай міласэрнасці – гэта заданне Бога для людзей. Яго найважнейшае заданне. Заданне, якое выяўляе глыбіню Яго жыцця: Яго трыадзінага жыцця. Больш выразны і пераканаўчы, чым гаворка аб Богу, з’яўляецца прыклад хрысціянаў, якія «ёсць адно», як Айцец і Сын ёсць адно.

**7.** Нішто на зямлі не праслаўляе Бога больш, чым братэрская міласэрнасць, бо, мы добра гэта ведаем, нішто на зямлі не з’яўляецца больш падобным да Яго.

Ці з’яўляецца гэта вашай мэтай: учыніць з вашай суполкі ПЛЁН МІЛАСЭРНАСЦІ?

*Айцец Анры Кафарэль*

### Дабробачанне

Я хацеў гаварыць з вамі аб зычлівасці, каб прааналізаваць гэтую рысу характару, так неабходную ў штодзённасці суполкі. Але падумаўшы, хачу, аднак, сказаць аб іншай рысе характару, яшчэ больш важнай, якая падрыхтоўвае і вядзе да зычлівасці.

Гэта рыса характару не мае назвы ў французскай мове. Гэта неістотна, назавём яе «дабробачаннем». Дабробачанне – гэта здольнасць бачыць дабро ва ўсім і ва ўсіх, хто

нас атачае. Гэта вытворная добрага характару. Гэта мастацтва. Гэта нялёгкае мастацтва!

Я ўзгадваю апавяданне аўтарства Дзюамэля. Гэта адбывалася падчас вайны. На працягу двух год ён жыў разам з маўклівым мужчынам, у якім, здавалася, памерла душа. Аднойчы гэты маўчун выціснуў з сябе слова, інтанацыя якога занепакоіла Дзюамэля: няўжо ў гэтым маўчуне ёсць незаўважаная ім раней глыбіня? Дзюамэль пастанавіў даследаваць гэта. «Я прысвяціў гэтаму шмат дзён з кіркой, матыкай і горнай лямпай. Я адкрываў праўду са здзіўленнем, з якім адкрываюцца падземныя пячоры, дзе плывуць нязведаныя рэкі, з каланадамі, са скляпеннямі…»

Кожнага чалавека трэба спачатку імкнуцца сапраўды спазнаць. А пасля паверыць у багацце яго глыбіні, багацце інтэлігенцыі, багацце сэрца, у тое, што з’яўляецца яшчэ больш шляхетным: у вобраз Бога, менш ці больш схаваны ў ім, адкрыццё Якога будзе сапраўды чароўным. Такое адкрыццё ўнутранага свету ў чалавеку патрабуе шмат цярплівасці, настойлівасці, добразычлівасці, павагі, напружанай, настойлівай увагі, скіраванай на яго густы, здольнасці; імкненні, паразы і захапленні, тысячы знакаў, праз якія можна ўгледзець унутранае жыццё.

Памятайце гэтае важнае даручэнне з казкі аб Маленькім Прынцы: «Добра бачыць адно толькі сэрца. Самага галоўнага вачыма не ўбачыш».

Паверце мне: ваша суполка неўзабаве будзе практыкаваць міласэрнасць, аб якой я казаў у лістападзе, калі толькі ўсе ўдзельнікі будуць практыкаваць ДАБРОБАЧАННЕ.

*а. Анры Кафарэль*

- ***Абмен думкамі на сустрэчы***

Прапанаваныя пытанні:

- Ці заўважылі вы здарэнні, сітуацыі, звязаныя з вашай суполкай, аб якіх маглі б сказаць, што гэта было сведчаннем любові да бліжняга?
- Ці атрымаў/атрымала ад кагосьці бескарыслівую дапамогу?
- Ці ўмееш бачыць дабро ва ўсім і ва ўсіх, хто вакол нас?

***Харызмат Руху і педагогіка***

*Рэкалекцыі*

---

«Штогадовы ўдзел у рэкалекцыях (прынамсі 48-гадзінных і, калі гэта магчыма, супольна з сужэнцам), каб стаць твар у твар з Богам».

Што такое суполка Notre-Dame?

---

На ўзор Хрыста, Які адыходзіў у пустынныя месцы, у горы, каб маліцца, нам трэба навучыцца адыходзіць ад свету, каб даць сабе шанец на сустрэчу з Богам.

Найперш, кожны з вас мае свой досвед з розных рэкалекцыяў. Рух прапаноўвае і чакае, каб кожнае сужэнства прайшло закрытыя, прынамсі 48-гадзінныя рэкалекцыі.

Істотным у закрытых рэкалекцыях з’яўляецца тое, што мы пакідаем дом, працу, клопаты і аддаем гэты час Госпаду Богу.

Адсутнасць часу для Бога з’яўляецца асноўным злом, якое ёсць у нашым жыцці. Менш ці больш, але мы жывём так, быццам Бога няма. Па сутнасці, прапанова Руху END для кожнага сужэнства гэта адно пасланне: давайце знойдзем час для Бога (малітва, Слова Божае, правілы жыцця) і для сябе (дыялог, сужэнская малітва). Важнае месца ў гэтым аддаванні часу Богу займаюць рэкалекцыі.

Поспех жыцця ўдваіх залежыць у вялікай ступені ад якасці і глыбіні спатканняў сужэнцаў. Без спатканняў мы не змаглі б пазнаць адзін аднаго і кахаць. Перажываць рэкалекцыі ўдваіх – гэта дазволіць Богу, каб Ён дакрануўся да нас разам. Гэта значыць навучыцца сустракацца з іншым дзеля яго самога. Бласлаўленне рэкалекцыяў удваіх вынікае з факту гэтых двух спатканняў, якія, па праўдзе, з’яўляюцца толькі адным спатканнем: аднаго з адным, удваіх з Богам.

Затрымацца ў цішыні, у крыніцы дабрадзействаў, дапамагае сужэнству ажывіць асабістае і сужэнскае духоўнае жыццё. Яно дапамагае паставіць Бога на першае месца, даведацца, якім чынам мы можам выпраменьваць любоў. Рэкалекцыі дапамагаюць узрастаць чалавечнасці і духоўнасці і прыводзяць да таго, што сакрамэнт сужэнства становіцца з кожным разам усё больш плённы.

Рэкалекцыі здзяйсняюць у нас навяртанне. Дапамагаюць лепш распазнаць жаданне Бога і прыводзяць да аднаўлення жыцця: больш малітвы, павагі, больш любові да сужэнца і да дзяцей, большы давер Богу, больш яснае разуменне таго, чым займаемся, і нашага служэння іншым.

Сведчанне на тэму перажывання рэкалекцыяў і іх плёну з’яўляецца важным для ўсёй экіпы. Наша святло з’яўляецца пазітыўным штуршком у духоўным развіцці ўдзельнікаў суполкі.

Рух END у Рэгіёне Беларусь арганізоўвае два віды рэкалекцыяў: кароткія, якія доўжацца ад вечара пятніцы да абеду ў нядзелю і даўжэйшыя, якія звычайна доўжацца з вечара чацвярга. У першых, карацейшых рэкалекцыях мы заахвочваем сужэнцаў прымаць удзел без дзяцей. Калі, аднак, пакінуць дзяцей дома не з’яўляецца магчымым, то трэба пастарацца, каб дзеці на працягу дня не займалі ўсёй увагі бацькоў. Можна зрабіць гэта, узяўшы з сабой людзей, якія будуць апекавацца дзецьмі. Зразумела, калі дзеці вельмі малыя, мы бярэм іх з сабой, у гэты час мы з імі знаходзімся ў фізічнай еднасці. Не перажывайце. Іншыя ўдзельнікі рэкалекцыяў вам дапамогуць. Даўжэйшыя рэкалекцыі звычайна адбываюцца летам і арганізоўваюцца такім чынам, каб была забяспечана апека над дзецьмі. Усю інфармацыю аб запланаваных рэкалекцыях можна знайсці на старонцы Руху.

Няма забароны на ўдзел у рэкалекцыях, якія арганізоўваюць іншыя рухі, іншыя арганізатары. Аднак Рух заахвочвае, каб асабліва падчас некалькіх першых год прыналежнасці да Руха, прымаць удзел у рэкалекцыях арганізаваных END. Вялікай каштоўнасцю такіх рэкалекцыяў з’яўляюцца сустрэчы з іншымі сужэнствамі, абмен досведам, якія вынікае з удзелу ў Руху, паглыбленне харызмату Руху.

## *Гасціннасць*

«Шырока практыкаваць у сем’ях адкрытасць і гасціннасць» (Карта END).

Equipes Notre-Dame заўсёды рабіла акцэнт на прыём гасцей, на гасціннасць дома – ці праз запрашэнне сужэнстваў з іншых суполак, ці праз запрашэнне ўсіх, каго мы сустракаем у штодзённым жыцці. Аб гасціннасці нагадваў таксама папа Павел VI 4 мая 1970 года ў Рыме:

«Я хацеў бы сёння напачатку звярнуць вашую ўвагу толькі на гасціннасць, якая з'яўляецца важнай апостальскай місіяй сужэнскай пары. Ці ж наказ святога Паўла ў лісце да Рымлянаў: «дбайце пра гасціннасць», не ёсць скіраваным першапачаткова да сем'яў і ці ж сам апостал, фармулюючы яго, не думаў аб гасціннасці сужэнства Аквілы і Прысцылы, з адкрытасці якіх першы і скарыстаў, і якія пазней павінны былі прыняць усю супольнасць хрысціян? У наш час, вельмі цяжкі для многіх, гэта ласка перажыць адкрытасць «маленькага Касцёла», ідучы за словамі святога Яна Златавуста, углыбіцца ў чуласць Касцёла, адкрыць яго мацярынства, адчуць міласэрнасць. Сапраўды, хрысціянская сям'я з'яўляецца «прамяністым і салодкім аблічам Касцёла». Гэта дарога апостальства, якое нічым не заменіш і шчодрае выкананне якога належыць вам. Гэта апостальства сужэнстваў, у якім фармацыя нарачоных, дапамога маладым сужэнствам, дапамога сем'ям у патрэбе ўтвараюць найважнейшыя сферы дзеяння».

Выражэннем гасціннасці з'яўляецца першая частка сустрэчаў, калі мы дзелімся жыццём пры супольным стале.

## *Сувязь экіпы з Рухам*

Пасля пілатажу суполка не падарожнічае адна. Сувязь з'яўляецца неабходнай для будавання супольнасці і адзінства, што надае сэнс прыналежнасці да Руху і вернасці яго мэтам, а таксама харызмату заснавальнікаў. Сувязное сужэнства забяспечвае сувязь суполкі з Сектарам. Яно ж падтрымлівае сужэнцаў з суполкі, каб яны маглі жыць сужэнскай духоўнасцю пры дапамозе педагогікі, прапанаванай Рухам.

## *Фінансавы ўклад у матэрыяльнае жыццё Руху*

«Сужэнствы, якія належаць да Руху, абавязаныя рабіць штогадовую ахвяру ў форме дару – плёну аднаго дня іх працы. Ахвяраванне гэтага дня працы павінна забяспечыць матэрыяльны быт і развіццё Руху, якому пары, у пэўнай ступені, абавязаныя сваім духоўным узбагачэннем».

Карта END

Рух Equipes Notre-Dame, як гаворыць сама назва, з'яўляецца рухам. Рух – гэта супольнасць асобаў, удзельнікамі якой становяцца людзі, якія ў выніку ўласна прынятага рашэння, абсалютна свабодна пастанаўляюць ісці да мэты, акрэсленай Рухам. Нагадаем, што мэтай Руху Equipes Notre-Dame, ёсць дапамога сужэнствам ва ўсёй паўнаце перажываць сакрамэнт сужэнства, або, як казаў айцец Кафарэль, «дапамагаць сужэнствам на шляху да святасці. Ні больш, ні менш». Гэта адзіная мэта Руху.

Хоць Рух END не з'яўляецца арганізацыяй у поўным значэнні гэтага слова, ён аднак карыстаецца некаторымі інструментамі, уласцівымі паняццю арганізацыі. Між іншым, Рух END валодае пэўнымі невялікімі сродкамі на патрэбы дзейнасці. Гэтыя сродкі паходзяць ад сужэнстваў, якія прынялі Карту і ўдзельнічаюць у жыцці Руху. Сужэнствы добраахвотна здаюць грошы, адпаведныя аднаму дню іх працы.

Вось некалькі важных заўвагаў, якія датычаць штогадовага дару аднаго дня працы:

- Нікога не прымушаюць перадаваць сродкі, якія адпавядаюць даходу аднаго дня працы сужэнства. Падобна, як іншыя пункты высілку, выконваць якія Рух не прымушае, а толькі прапануе. Падобным чынам з дарам аднаго дня працы. Аднак тыя сужэнствы, якія ўступаюць у Рух і ўдзельнічаюць у жыцці Руху, павінны прымаць усе правілы Руху. Выбарачнае выкананне правілаў Руху азначае, што сужэнства стварае свой уласны рух і тым самым адмаўляецца ад прыналежнасці да Суполак Маці Божай. Ёсць, аднак, пэўная розніца паміж іншымі пунктамі высілку і дарам дня працы. У выпадку іншых пунктаў высілку сужэнства прызнае толькі, што будзе шчыра прыкладаць намаганні, каб выконваць прапанаваныя пункты. Сужэнства не можа акрэсліць, калі яго намаганні дадуць канкрэтны эфект. Акцэнт ставіцца на высілак. Аднак у выпадку дара працы мы не прызнаем высілку, мы прызнаем дзеянне, якое заключаецца ў перадачы даходаў ад аднаго дня працы на карысць Руху.
- Сродкі, якія мы перадаём, маюць характар «дару». Гэта не аплата сяброўства, не даніна, не страхоўка, гэта проста дар. Сутнасцю дара з'яўляецца сэрца, адкрытае на дабро, якога можна дасягнуць праз ахвяраваны дар. Сужэнствы могуць знаходзіцца ў розных матэрыяльных становішчах. І бывае так, што не даюць са сваіх лішкаў. Магчыма, аддаюць штосьці, чаго ім не хапае. У такім выпадку дар набывае асаблівую вартасць. Тады ён заключае ў сабе асаблівую рысу, якую мы сустракаем на старонках Евангелля.

*«Езус, (...) сеўшы насупраць скарбонкі, назіраў, як людзі кідалі грошы ў скарбонку. Многія багатыя кідалі памногу. Прыйшла адна бедная ўдава і ўкінула дзве лепты, што складае адзін кадрант. Паклікаўшы вучняў сваіх, Езус сказаў ім: «Сапраўды кажу вам, што гэтая бедная ўдава ўкінула больш за ўсіх, хто кідаў у скарбонку. Бо ўсе кідалі, маючы лішак, а яна, будучы ў нястачы сваёй, укінула ўсё, што мела, увесь пражытак свой»* (Мк 12, 38-44).

### 3. Заданні на час паміж сустрэчамі 

- **Памятайце аб штодзённай малітве** ***МАГНІФІКАТ.***
- Памятайце аб рэалізацыі ўведзеных канкрэтных пунктаў высілку.
- Прачытайце тэкст на наступную сустрэчу. Дашліце свае прапановы, пытанні, разважанні.
- Падрыхтуйцеся да дзялення жыццём на наступнай сустрэчы.
- Прачытайце тэкст Карты. Падрыхтуйце і дашліце пілатуючай пары пытанні, якія ўзніклі ў вас пасля прачытання Карты.

## Дадатак

Практычныя заўвагі, якія датычаць дару аднаго дня працы.

- Як практычна можна перадаць дар аднаго дня працы? Мы перадаём яго да канца сакавіка, кожны каляндарны год. Таму самае позняе на сакавіцкай сустрэчы збіраем грошы ў кожнага сужэнства. Зручным спосабам з'яўляецца падрыхтаваць канверт, у які кожнае сужэнства асобна кладзе свой дар. Ніхто не правярае, колькі грошай паклалі сужэнцы. Аднак пасля сустрэчы адказная пара суполкі падлічвае, якая сума была сабраная і ўкладывае ў асобны канверт картку з інфармацыяй пра суполку і суму. Адказная пара перадае гэты канверт сувязной пары суполкі. Пасля грошы трапляюць да пары Сектара, якая перадае належную суму пары Рэгіёна.
- Як акрэсліць велічыню аднаго дня працы? Гэта зрабіць дастаткова проста. Напрыклад:

***а)*** Бяром свой сумарны гадавы заробак, адлічваем падатак і дзелім яго на 252 (сярэдняя лічба дзён працы за год).

***б)*** Таксама можна ўзяць сярэдні штомесячны заробак і падзяліць на сярэднюю колькасць працоўных дзён (прыкладна 21).

Калі нехта атрымлівае заробак не толькі на асноўнай працы, а недзе яшчэ, то яго таксама трэба ўлічваць пры падліку працы аднаго дня.

Гэта практыка – таксама добрая нагода каб зрабіць сваю ўласную бухгалтэрыю, дзе сям'я зможа планаваць і размяркоўваць грошы на бягучыя і будучыя выдаткі.

- На што трацяцца грошы, якія перадаюць сужэнствы? Агульную інфармацыю на тэму кіравання дабротамі падае артыкул 8 Кананічных Статутаў Equipes Notre-Dame. Сабраныя сродкі па частках перадаюцца адказным на сусветным узроўні. Грошы, якія застаюцца, выкарыстоўваюцца, каб фінансаваць Рух на гэтай тэрыторыі – у Беларусі, на узроўні Рэгіёну, Сектару. Яны, паміж іншым, пакрываюць кошты падарожжаў адказных, якія ў рамках свайго служэння прымаюць удзел у сустрэчах у Рэгіёне, Сектары.

Прыкладам такіх праектаў можа быць фінансаванне:

- правядзення калегіума Рэгіёну, на якім праводзіцца фармацыя Сувязных пар і Адказных пар Сектараў;
- сустрэча экіпы Сектара, на якой абмяркоўваецца сітуацыя ў Сектары і выпрацоўваецца план мерапрыемстваў на наступны фармацыйны год;
- сустрэча Адказных пар суполак, на якой праводзіцца фармацыя Адказных пар;
- дня Сектара, на якім усе сужэнствы Сектара сустракаюцца для інтэграцыі;
- забеспячэнне пілігрымак і аплатковага спаткання;
- прэзентацыя Руху у іншых гарадах Беларусі;
- пілатажы, звязаныя з даездам пілатуючай пары ў іншыя гарады.